**ПРОСТЫ СКАЗ –** прэдыкатыўная адзінка, у складзе якой знаходзіцца адна прэдыкатыўная аснова.

Класіфікацыя простага сказа ўлічвае некалькі асноўных крытэрыяў:

паводле **адносін зместу да рэчаіснасці**:

***сцвярджальныя сказы*** – сказы, у якіх падзеі і факты ўсведамляюцца як рэальныя або магчымыя: *Дарога вывела мяне на дзялянку* (М. Стральцоў);

***адмоўныя сказы*** – сказы, у якіх падзеі і факты ўсведамляюцца як нерэальныя або немагчымыя:

1) пры поўным адмаўленні (часціца *не* знаходзіцца перад выказнікам) сказы называюцца агульнаадмоўнымі: *Вясна не хацела мірыцца з упартай зімой* (В. Карамазаў);
2) пры адмаўленні асобных фактаў і ўласцівасцей (часціца *не* знаходзіцца перад дзейнікам або дадanymі членамі) сказы – прыватнаадмоўныя: *Не азіраючыся, я пайшоў* (А. Марціновіч);

паводле **мэты выказвання**:

***апавядальныя сказы*** – сказы, якія паведамляюць (сцвярджаюць або адмаўляюць) рэальныя або магчымыя падзеі і факты, вылучаюць:

1) уласна-апавядальныя – толькі паведамляюць пра падзеі і факты: *Світае. Ідзе дождж. Шумяць дрэвы* (М. Лынькоў);
2) апісальна-апавядальныя – паведамляюць і характарызуюць падзеі і факты: *Аднаго разу марознай раніцай брыў Лаўрэн па сыпкім снезе на шырокіх лыжах-самаступах* (Э. Самуйлёнак);

***пытальныя сказы*** – сказы, у якіх выражаецца пытанне, звернутае да субяседніка з мэтай што-небудзь высветліць; адрозніваюць:

1) агульнапытальныя (адказу *так* або *не* патрабуе сказ у цэлым, у якім факультатыўна могуць ужывацца пытальныя часціцы *ці, хіба*: *Ці не казку лес складае?* (Я. Купала); *Хіба ж не радасць наш час?* (Я. Колас); *Маці на ферме працуе?* (М. Ракітны));

2) часткова-пытальныя (адказу ў форме няпоўнага сказа ў іх патрабуюць пытальныя займеннікі і прыслоўі: *Хто ён, гэты чалавек?* (І. Шамякін); *Калі настане слаўная пара?* (М. Чарот));

а) уласна-пытальныя – сказы, якія патрабуюць абавязковага адказу: *Няўжо паедзем? У такую цемень? На кані?* (І. Мележ);

б) пытальна-рытарычныя – сказы, якія не патрабуюць адказу, таму што адказ вынікае са зместу: *Хіба ж не любавацца сваім прыгожым краем?!* (Я. Купала);

в) пытальна-пабуджальныя – сказы, якія выражаюць просьбу або прапанову выканаць пэўнае дзеянне: *Мо ў школу пойдзеш ты?* (Я. Колас);

***пабуджальныя сказы*** – сказы, у якіх выражаецца волевыяўленне, пабуджэнне да дзеяння ў форме заклiку, загаду, просьбы, парады; адрозніваюць:

1) уласна-пабуджальныя – сказы, якія маюць канкрэтнага адрасата: *Адстукай, вецер, мне дэпешу кляновым голлем на акне* (П. Броўка);
2) пажадальныя – сказы, у якіх пажаданне не скіравана да канкрэтнага адрасата: *Зберагчы для людзей патрэбна больш святла, цеплыні, дабраты* (А.Пысін);

паводле **эмацыйнай афарбоўкі**:

***няклічныя сказы*** (*нейтральныя*) – сказы, у якіх перадача зместу адбываецца без выражэння эмацыйных адносін: *Пачынала світаць* (У. Дамашэвіч);

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Успаміны непазбежна звязаны з вяртаннем у сваё мінулае, у першыя вёсны маладосці* (Я. Семяжон);

***клічныя сказы*** – сказы, у якіх перадача зместу суправаджаецца выражэннем эмацыйных адносін (абурэння, радасці, захаплення, здзіўлення, заклiку): *Бачыў ты!? Слова нельга сказаць!?* (К. Чорны); *Ах, добра летам каля рэчкі!* (Я. Колас); *Як прыемна пахне збожжа!* (Я. Колас); *Усім народам – мір і шчасце!* (А. Астрэйка);

паводле **колькасці саставаў**:

***двухсастаўныя сказы*** – сказы, граматычная аснова якіх складаецца з дзейніка (аднаго або з залежнымі членамі) і выказніка (аднаго або з залежнымі членамі): *І вось мінуў час* (В. Палтаран); *Пад нагамі шастала сівае, апечанае замаразкам, лісце* (В. Адамчык);

***аднасастаўныя сказы*** – сказы, граматычную аснову якіх складае адзін галоўны член з залежнымі ад яго словамі або без іх (па форме ён нагадвае дзейнік або выказнік): *Круглае поле. Узгоркі. Каменне* (Я. Колас); *Ветру не было цэлы дзень* (М. Дзелянкоўскі) (гл. **АДНАСАСТАЎНЫ СКАЗ**);

паводле **наяўнасці даданых членаў**:

***неразвітыя сказы*** – сказы, у структуры якіх толькі галоўныя члены або адзін з іх – дзейнік ці выказнік: *Ішоў снег* (В. Быкаў); *Была субота* (М. Стральцоў); *Палессе!* (У. Караткевіч);

***развітыя сказы*** – сказы, якія ў сваім саставе, акрамя галоўных членаў (ці аднаго з іх), маюць і даданыя (або адзін з іх): *Наўкол маўклівая таямнічая тайга* (С. Грахоўскі); *Не кожны дзень выпадае чалавеку шчасце пахадзіць пад такім цудоўным дажджом* (М. Капыловіч); *Колькі навокал прыгожага!* (Я. Брыль);

паводле **наяўнасці або адсутнасці структурна неабходных членаў сказа**:

***поўныя сказы*** – сказы з усімі наяўнымі членамі, неабходнымі для поўнага разумення сэнсу, незалежна ад кантэксту і моўнай сітуацыі: *Снег пацерушыў трохі і перастаў* (І. Мележ);

***няпоўныя сказы*** – сказы, у якіх адсутнічаюць канструкцыйна неабходныя галоўныя або даданыя члены сказа, відавочныя з кантэксту ці моўнай сітуацыі: *Садавод нясе ранеты, палявод гарох паспеты, я ж паэмы і санеты* (П. Броўка) (гл. **НЯПОЎНЫ СКАЗ**);

паводле **наяўнасці або адсутнасці элементаў ускладнення**:

***ускладненыя сказы*** – сказы, у склад якіх уключаны элементы ўскладнення; элементамі ўскладнення з'яўляюцца: аднародныя члены сказа (гл. **АДНАРОДНЫЯ ЧЛЕНЫ СКАЗА**), адасобленыя члены сказа (гл. **АДАСОБЛЕНЫЯ ЧЛЕНЫ СКАЗА**), пабочныя (гл. **ПАБОЧНЫЯ КАНСТРУКЦЫІ**) і ўстаўныя канструкцыі (гл. **УСТАЎНЫЯ КАНСТРУКЦЫІ**), звароткі (гл. **ЗВАРОТАК**) і інш. (гл. **ПАРАЎНАЛЬНЫЯ КАНСТРУКЦЫІ**): *Шмат добрых і славутых імёнаў дала нам беларуская літаратура* (П. Пруднікаў); *Тут, у Вільні, разгортвалася ўся дзейнасць філаматаў* (К. Цвірка ); *На шчасце, бераг выдаўся вельмі ўтульны* (Я. Маўр); *Рака Ушача, Ушачка, Ушачанка (кожны па-свойму ласкава называе яе) дала імя гораду і сама заплыла ў гістарычныя дакументы* (Р. Барадулін); *Не праспі вясну, суседзе!..* (П. Глебка); *Кожная рака, нібы жывая істота, мае свой нораў, свой характар, сваё аблічча, свой непаўторны, адменны выгляд* (В. Вольскі);

***няўскладненыя сказы*** – сказы, у складзе якіх адсутнічаюць элементы ўскладнення: *Учора вячэрняе неба было шэрае* (В. Вольскі); *Толькі пад вечар на супрацьлеглым беразе Усолкі загрукаталі трактары* (С. Шушкевіч);

паводле **структурнай арганізацыі**:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*сінтаксічна падзельныя сказы* (*расчлянёныя, членныя*) – сказы, у якіх вылучаюцца галоўныя і даданыя члены сказа: *Вуліца яшчэ дыхала ранішнім халадком* (Н. Маеўская); *Бабіна лета прала серабрыстае павуцінне* (А. Асіпенка);

*сінтаксічна непадзельныя сказы* (*нерасчлянёныя, нячленныя, словы-сказы*) – сказы, у якіх немагчыма вылучыць асобныя члены без разбурэння, страты адзінства зместу: *"Во, можна і напіцца?" – "Чаму ж не", – сарамяжна-ветлівай усмешкай адказала маладзіца* (В. Адамчык) (гл. **СЛОВЫ-СКАЗЫ**).

**Віды сінтаксічнай сувязі кампанентаў простага сказа** – граматычныя паказчыкі, якія адлюстроўваюць фармальнае выражэнне сінтаксічных адносін паміж кампанентамі простага сказа.

Вылучаюць наступныя віды сінтаксічнай сувязі кампанентаў простага сказа:

**прэдыкатыўная сувязь** – сувязь паміж дзейнікам і выказнікам як асноўны від сінтаксічнай сувязі, у выніку якой спалучэнні слоў ператвараюцца ў сказ; адрозніваюць наступныя тыпы прэдыкатыўнай сувязі:

а) ***каардынацыя*** – фармальна выражаная пры дапамозе канчаткаў, формаў ліку, а ў адзіночным ліку – і формаў роду сувязь паміж дзейнікам і выказнікам, якая мае характар узаемнага падпарадкавання: *Кветкі пахнуць; Лес быў сцюдзёны; Сёння я ўстаў рана* (гл. **КААРДЫНАЦЫЯ**);

б) ***суразмяшчэнне*** – фармальна не выражаная сувязь паміж дзейнікам і выказнікам, якая выяўляецца лагічна з улікам парадку слоў (суб'ект-дзейнік знаходзіцца перад прэдыкатам-выказнікам): *Песня Янкі Купалы і цяпер з намі* (М. Лужанін); *Парк – у асеннім убранні* (М. Чарот); *Не хвалявацца – галоўнае зараз* (Я. Колас);

в) ***прыцягненне*** – апасродкаваная сувязь паміж асабовай формай дзеяслова-звязкі і выказальнай часткай састаўнога іменнага выказніка: *Дні тады стаялі цёплыя, нават душнаватыя* (А. Жук); *Гэты хутар быў вясёлым месцам* (В. Адамчык);

**паўпрэдыкатыўная сувязь** – сувязь паміж сказам і адасобленымі членамі, выражанымі дзеепрыметнымі або дзеепрыслоўнымі зваротамі, а таксама адасобленымі прыдаткамі: *1) У цёмным небе, усыпаным буйнымі зоркамі, стаяў поўны месяц* (Р. Ігнаценка); *2) Іду праз Івянец, старадаўні гарадок, углядаюся* (М. Вышынскі);

**паясняльная сувязь** – сувязь паміж сказам і тымі адасобленымі членамі, якія канкрэтызуюць змест іншых членаў сказа: *Максім адышоў убок, да сваёй хаты* (І. Шамякін); *Мы спалі мала, усяго дзве гадзіны* (М. Зарэцкі);

**злучальная сувязь** – сувязь паміж сінтаксічна раўнапраўнымі адзінкамі, такімі, як аднародныя члены сказа: *Пахнуць вятры хвояй, перакіслаю чырванню пажоўклых брусніц, перагорклым дымам лесавых выгараў ды сівымі імшарынамі балот* (М. Лынькоў);

**суадносная сувязь** – сувязь паміж сказам і звароткамі, пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі: *Сумаваць я, сябры, не прывык* (П. Панчанка); *Дожджык, і праўда, так і паўзе за каўнер* (Я. Брыль); *Міхал – навошта ўжо таіцца? – любіў-такі павесяліцца* (Я. Колас);

**параўнальная сувязь** – сувязь паміж сказам і параўнальным зваротам: *Пырскі кроххкія, як шкло, узлятаюць пад вяслом* (П. Глебка);

**далучальная сувязь** – сувязь паміж сказам і далучальнай канструкцыяй: *Аўгінька адным вокам, ды і то з-пад ілба, пазірала на прысутных* (М. Зарэцкі);

**падпарадкавальная сувязь** – сувязь паміж сінтаксічна нераўнаправўнымі адзінкамі (рэалізуецца паміж членамі сказа): *Каля маёй роднай вёскі ёсць крынічка* (В. Шымук).

*М.С.Ржавуцкая*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ